Судовыя прыставы канфіскавалі аўтамабіль у таксіста ў Мінску з-за нявыплачанага доўгу перад прадпрыемствам. У яго таксама ёсць 10 сутак, каб пазбавіцца ад доўгу і вярнуць сваю маёмасць. СТАР 2

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

31 КАНАЛ

Выстава «Марк Шагал: жыццё і каханне» — вельмі дарагое задавальненне, якое патрабавала шмат грашовых высілкаў, вырашэння пытання працаёмкай транспарціроўкі. СТАР 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

2 ЛІСТАПАДА 2012 г. ПЯТНІЦА № 213 (27328) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРАПАНОЎВАЕ ПАСТУПОВА ПРЫВОДЗІЦЬ ДА ЎЛАДЫ МАЛАДЫХ ПАЛІТЫКАЎ

Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў на пасяджэнні Выканкама Нацыянальнага алімпійскага камітэта Беларусі, перадае БЕЛТА.

«Настаў час новага пакалення палітыкаў ва ўсіх сферах і па ўсіх напрамках, — адзначыў Прэзідэнт. — Сёння наша задача — спакойна, без усялякага шуму і гвалту, прывесці да ўлады нармальных маладых палітыкаў — 40-45 гадоў, да 50 гадоў». «Вечна сядзець у крэслах цяперашнія кіраўнікі не будуць», — адзначыў ён.

«Я не прыхільнік таго, каб у 25 гадоў прызначаць міністрамі, і не толькі таму, што гэта людзі нявопытныя, а важна, як яго будуць успрымаць, калі ён прыйдзе і пачне кіраваць людзьмі з вялікімі пагонамі, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Я гэта праходзіў, у 38 гадоў стаўшы Прэзідэнтам, і вельмі добра гэта ведаю. Я зразумеў, што ўсяму павінен быць свой час, у тым ліку што тычыцца ўзросту, вопыту людзей».

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што пасля апошніх кадравых прызначэнняў у спорт прыйшлі сур'ёзныя кіраўнікі, якія маюць вялікі вопыт. Ён заявіў, што не назначае людзей па прынцыпу «свой-чужы». «Назначэнне на любыя пасады не павінна адбывацца па прынцыпе адданасці. Не думайце, што ні з сяго ні з таго я назначаю людзей, я іх сур'ёзна вывучаю перш, чым назначыць, — сказаў ён. — Галоўнае заключаецца ў тым, каб чалавек быў прафесіянальным, каб у яго гарэлі вочы, каб ён на сваёй рабоце стараўся зрабіць максімум».

Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, чаму назначыў новых кіраўнікоў у сферы спорту. «Я рэкамендаваў першым віцэ-прэзідэнтам НАК Ігара Рачкоўскага — лічу, ён чалавек перспектыўны ў гэтай сферы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што спорт стаў не толькі вялікай палітыкай, але і вялікай эканомікай: «Для спорту стала важнейшай рысай разбурэнне нацыянальных межаў і выхад на шырокае поле міжнародных адносін». СТАР 2

УДЗЕЛЬНІКАМ І ГАСЦЯМ XIX МІНСКАГА МІЖНАРОДНАГА КІНАФЕСТЫВАЛЮ «ЛІСТАПАД»

Дарагія сябры!

Ад усёй душы віншую вас з адкрыццём XIX Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад».

Гэты фестываль — яркае сведчанне таго, што кіно з'яўляецца найважнейшым з мастацтваў, якое заваявала сэрцы мільёнаў людзей. «Лістапад», які ўзнік у вельмі няпросты перыяд гісторыі, за мінулыя гады ператварыўся ў адну з галоўных падзей сучаснага культурнага жыцця, заслужыў высокі міжнародны статус і набыў сапраўды планетарны размах. Але пры гэтым застаўся верны свайму прызначэнню — служыць ідэалам гуманізму і духоўнасці, несці з экрана гледачам святло праўды і дабра.

Сёлета «Лістапад», які нездарма называюць фестывалем фестываляў, сабраў лепшыя сусветныя кінапрэм'еры і іх цудоўных аўтараў, чые талент і майстэрства нараджаюць сапраўдныя шэдэўры. Упэўнены, што мінскі форум будзе багаты на цікавыя сустрэчы і мастацкія адкрыцці, адзначыць узнагародамі самых годных і стане незабыўным святам для прыхільнікаў кіно.

Жадаю канкурсантам удачы, членам журы — плённай працы, а ўсім удзельнікам і гасцям фестывалю — здароўя, натхнення, шчасця і поспехаў.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

УСЁ ДЛЯ КОЛАСА

З нагоды 130-годдзя народнага паэта Беларусі Якуба Коласа па ўсёй рэспубліцы праходзяць урачыстыя мерапрыемствы. Гэта ўсё для яго. Але ён зрабіў для Беларусі нашмат больш

Учора распачалося літаратурнае свята «Каласавіны-2012», якія адбываюцца штогод напярэдадні святкавання дня народзінаў народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. Сёлета «Каласавіны» прысвечаны 130-годдзю Песняра.

Падчас пасяджэння «круглага стала» з кіраўнікамі ўстаноў, якія носяць імя Якуба Коласа, абмяркоўваліся пытанні папулярызацыі імя Коласа ў Беларусі і за мяжой, яго творчай спадчыны. Пісьменнік і намеснік Старшыні рэспубліканскага савета па справах культуры і мастацтва пры Савеце Міністраў Анатоль Бутэвіч адзначыў, што ў свеце, напрыклад, налічваецца каля 5 тысяч аб'ектаў, звязаных з іменем украінскага Песняра Тараса Шаўчэнкі. Мы адносна Якуба Коласа яшчэ не можам пахваліцца такімі лічбамі. І трэба старацца выправіць сітуацыю, бо гэта імідж краіны ў свеце. СТАР 2



Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

ДЗЯДЫ ГЛЯДЗЯЦЬ НА НАС З НЯБЁСАЎ

ДЗЯДЫ — свята сакральнае. Такім яго ўспрымаюць і сучасныя беларусы. Праваслаўныя адзначаюць Змітраўскую памінальную суботу ў першую суботу перад 8 лістапада. А ў каталікаў акурат сёння, 2 лістапада, Задушны дзень. Але Дзядоў у беларусаў шмат. У залежнасці ад мясцовасці, мы можам адзначаць Дзяды некалькі разоў на год вясной і ўвосень. Самымі галоўнымі лічацца восеньскія Дзяды — Асяніны. Тут мы ўпрыгожваем стол рытуальнымі стравамі. Прычым патрэбна, каб на стале іх абавязкова была няцотная колькасць: куцця, клёцкі, бліны, мяса, яечня. З Дзядамі звязана і шмат народных прыкмет. Кажуць, якое надвор'е на Дзяды, такімі будуць Каляды і нават Вялікдзень.

Да Дзядоў трэба дарасці. Бо гэта нямалое свята. Старадаўняе. Глыбокае. Спачатку язычніцкае, пазней хрысціянскае, са сваімі адрозненнямі ў праваслаўных і каталікаў. У Беларусі яно з цягам часу набыло і шмат іншых канатацый, чым толькі ўшанаванне памяці святых і спачылых продкаў урачыстай вячэрай і паходам на могілкі. Дзяды — гэта нешта такое пракаветнае беларускае, што здаецца кожны ведае пра гэтыя дні, ведае, што трэба ў іх рабіць, але не кожны можа сказаць пра Дзядоў штосьці ўцямнае. Таму што гэта глыбіннае свята, нават падсвядомае — яго можна больш адчуць, чым апісаць словамі. А між тым, менавіта ў беларусаў захаваўся абрад Дзядоў у найбольш архаічнай форме. У гэтым сэнсе Беларусь, наогул, унікальная краіна. У нас і народныя песні, паданні і легенды таксама захаваліся больш, чым дзе-небудзь у свеце. А ўсё таму, што занадта шмат у гісторыі нашай краіны было часоў, калі культурная спадчына перадавалася выключна з вуснаў у вусны. Таму што беларуская мова была забаронена для пісьмовага ўжытку і наогул лічылася мужыцкай і ганебнай, а беларуская культура не прызнавалася. Таму так важна было нашым продкам захаваць тое, што яны мелі. Пры ўсіх мінусах, у нейкім сэнсе гэта і загартавала наш народ. Прынамсі, дапамагло захаваць, напрыклад, абрад Дзядоў. Бо тое, што забараняюць і не прызнаюць, насуперак усяму набывае звышсэнс, звышкаштоўнасць. Асабліва, калі гэта нешта роднае.

Калі я была зусім малая, часта бавіла час у бабулі ў вёсцы, што ў Віцебскай вобласці. Тады я мала што разумела ва ўшанаванні памяці памерлых або загінулых продкаў. Дзяды асацыяваліся ў мяне з паходам на дзедаву магілу, якую мы старанна прыбіралі і абкладалі дзірваном, з куццёй, сціплым сямейным застоллем. З часам Дзяды, як сімвал ушанавання памяці продкаў і наогул культурнай і гістарычнай спадчыны, сталі жыццёвай пазіцыяй. І пра гэта зусім не абавязкова крычаць. Калі кожны будзе шчыра шанаваць Дзядоў унутры сябе, з часам гэта можа даць нашмат больш важкі вынік.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

ЛІЧБА ДНЯ

157 млрд рублёў,

або 0,04 працэнта ВУП склаў прафіцыт рэспубліканскага бюджэту Беларусі па выніках студзеня-верасня 2012 года, паведаміла Міністэрства фінансаў. Даходы рэспубліканскага бюджэту склалі Br66,847 трлн, або 69,9 працэнта ўдакладненага гадавога плана, расходы — Br66,690 трлн, або 69,6 працэнта ўдакладненага гадавога плана. Па стане на 1 кастрычніка 2012 года расходы на агульнадзяржаўную дзейнасць склалі Br23,1 трлн (60,5 працэнта), на фінансаванне нацыянальнай эканомікі — Br21 трлн (72,8 працэнта), на фінансаванне сацыяльнай сферы (сацыяльная палітыка, адукацыя, ахова здароўя, фізічная культура, спорт, культура і сродкі масавай інфармацыі, Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва) накіравана Br83,5 трлн (76,3 працэнта).

НАДВОР'Е СЁННЯ

Брэст	+ 11°
Віцебск	+ 5°
Гомель	+ 6°
Гродна	+ 9°
Магілёў	+ 4°
Мінск	+ 5°

Курсы замежных валют, установленыя НБ РБ з 02.11.2012 г.

Долар ЗША	8490,00 ▼
Еўра	10 980,00 ▼
Рас. руб.	270,50 ■
Укр. грыўня	1040,06 ▼

■ Погляд

СІРОТЫ НЕ ПАВІННЫ ВЫХОЎВАЦЦА Ў ІНТЭРНАЦЕ

Дзеці па розных прычынах застаюцца без бацькоў. У кагосьці маці і бацька памерлі альбо загінулі (на шчасце, гэта здараецца даволі рэдка). Значна часцей дзеці становяцца сіротамі сацыяльнымі. Гэта значыць, што іх бацькі жывыя, але пазбаўлены адпаведных правоў. Як бы там ні было, але маленькі чалавечак аказваецца на раздарожжы. Яго чакае альбо дзіцячы дом-інтэрнат, альбо прыёмная сям'я.

Яшчэ ў 2006 годзе Прэзідэнт краіны заявіў, што ўсе дзеці, якія выхоўваюцца ў дамах-інтэрнатах, паступова будуць пераведзены ў дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Сапраўды, кожнае дзіця мае права жыць у сям'і. Але аднаго гэтага недастаткова. Трэба яшчэ і навучыць новых бацькоў працы з такімі дзеткамі, бо не кожны з іх валодае адпаведнымі ведамі. Тым больш што некаторыя сіроты маюць асаблівасці псіхафізічнага развіцця. Для такіх дзяцей вельмі неабходны сямейны клопат, каб яны не адчувалі сябе пакрыўджанымі ад прыроды. Гэтая мадэль навучання атрымала назву ПРАЙД.

Прадстаўніцтва Міжнароднага дзіцячага фонду ў Рэспубліцы Беларусь пры падтрымцы Агенцтва ЗША па міжнародным развіцці з кастрычніка 2005 года актыўна садзейнічае таму, каб кожнае дзіця, якое па розных прычынах страціла бацькоўскую апеку, знайшло яе ў новай сям'і. Але па-сапраўднаму масавая праца пачалася тры гады таму. І праца прынесла плён: зараз дзеці-сіроты трапляюць у інтэрнат толькі ў выключных выпадках. СТАР 2

■ Вогненныя вёскі

БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ

У наступным годзе спаўняецца 70 гадоў адной з буйнейшых экспедыцый гітлераўскіх карнікаў «Зімовае чараўніцтва», якую фашысты ўчынілі на тэрыторыі цяперашняга Верхнядзвінскага раёна. Гэтая аперацыя па знішчэнні мірнага насельніцтва — адна з самых жорсткіх з боку акупантаў і іх памагатых на тэрыторыі нашай краіны.

На Верхнядзвіншчыне падчас Вялікай Айчыннай вайны фашысты спалілі 426 вёсак, у тым ліку больш за 300 — разам з усімі жыхарамі або іх часткай. Цяпер у раёне жыве больш за тысячу былых насельнікаў «вогненных» вёсак, якія выратаваліся ад страшнай смерці ценой неверагодных фізічных і маральных выпрабаванняў, вынеслі ўвесь цяжар пасляваеннай разрухі і не атрымалі якой-небудзь кампенсацыі за ваенныя нягоды. Усе яны ўжо пенсіянеры, сотні знаходзяцца ў сталым узросце, у большасці слабае здароўе.

Былы Асвейскі раён, частка цяперашняга Верхнядзвінскага.. Ён стаў адзіным у Беларусі раёнам, дзе былі спалены дашчэнту не толькі ўсе населеныя пункты, але і ўсе жылыя і гаспадарчыя пабудовы, а ў жывых застаўся з кожных трох жыхароў адзін. Пакуты, якія выпалі на долю асвеякоў, апісаны ў дакументах, дакументальна-мастацкай і мемуарнай літаратуры, пра іх распавядаў свету публіцыстычны артыкул А.Талстога «Асвейская трагедыя». СТАР 2

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

УРАГАН «СЭНДЗІ» ПРЫВЁЎ ДА РАЗЛІВУ МІЛЬЁНА ЛІТРАЎ ПАЛІВА ЛЯ БЕРАГОЎ НЬЮ-ДЖЭРСІ

З-за ўрагану «Сэндзі» з тэрыторыі нафтаперапрацоўчага завода ў штаце Нью-Джэрсі ў заліў Вудбрыдж трапіла больш за мільён літраў паліва, паведамляюць інфармагенцтвы.

Уцечка 1,1 млн літраў нафтапрадуктаў адбылася з-за расколіны ў адным з паліўных рэзервуараў. На месцы здарэння вядуцца работы па ліквідацыі аварыі, а таксама збор нафтавай плёнкі, што ўтварылася на паверхні вады, з дапамогай спецыяльных бонавых агароджаў.

Разбуральны ўраган «Сэндзі» 29 кастрычніка абрынуўся на ўсходняе ўзбярэжжа ЗША. Па апошніх звестках, яго ахвярамі ў ЗША і Канадзе сталі больш за 70 чалавек. Найбольшую шкоду ўраган нанёс Нью-Ёрку, дзе, па некаторых звестках, загінулі 32 чалавекі і моцна пацярпела гарадское метро. Да гэтага часу без святла застаюцца жыхары ўсяго ўсходняга ўзбярэжжа. Па падліках экспертаў, шкода ад урагану складзе да $20 млрд. Такім чынам, «Сэндзі» стане самым «дарагім» стыхійным бедствам у гісторыі ЗША.

Прэзідэнт Барак Абама здзейсніў паездку па штаце Нью-Джэрсі. Кіраўнік дзяржавы асабіста сустрэўся з пацярпелымі людзьмі і не проста паабяцаў падтрымку, але і ўстанавіў «правіла 15 хвілін», на працягу якіх яго каманда абавязваецца даваць адказ губернатарам і мэрам, якія запытваюць федэральную дапамогу.

ГОРАД У ШВЕЦЫІ ЗАПЛАЦІЎ БЕСПРАЦОЎНЫМ ЗА ПЕРАЕЗД У НАРВЕГІЮ

Улады горада Сёдэрхамн на ўсходзе Швецыі вырашылі выплачваць маладым жыхарам горада, якія засталіся без працы, кампенсацыі на пераезд у Нарвегію. Як паведамляе шведскае выданне Local, прапановай ужо скарысталася больш за сто чалавек. Усяго ў горадзе, размешчаным за 250 кіламетраў ад Стакгольма, пражывае каля 12 тысяч чалавек. Гарадской моладзі, якая згадзілася ехаць у Осла для атрымання там работы, улады Сёдэрхамна аплачваюць квіток да сталіцы Нарвегіі і пражыванне ў хостэле на працягу месяца з разліку прыкладна 25 еўра ў суткі. Акрамя таго, маладых людзей забяспечваюць інструкцыямі па пошуку працы.

Праграма «Падарожжа за працай» была арганізавана адміністрацыяй Сёдэрхамна сумесна з Нацыянальнай службай занятасці і накіравана на скарачэнне ўзроўню беспрацоўя. У Сёдэрхамне яна перавышае 25 працэнтаў.

ТРЫ ДЗЯЎЧЫНЫ ЗАГІНУЛІ ПАСЛЯ ХЭЛОЎІН-ВЕЧАРЫНКІ Ў МАДРЫДЗЕ

Тры дзяўчыны, якія адзначалі Хэлоўін у Мадрыдзе, загінулі падчас вечарынкі, прысвечанай гэтаму святу. Дзве з іх памерлі па дарозе ў бальніцу ў карэце хуткай дапамогі, трэцяя — у прыёмным пакоі медыцынскай установы.

У зале забаўляльнага комплексу, дзе ва ўсю ішло святкаванне дня ўсіх ведзьмаў і чарцей, нехта кінуў у натоўп падпалены фаер, у выніку чаго ўзнікла паніка і цісканіна, у якой тром дзяўчатам ва ўзросце ад 18 да 25 гадоў стала дрэнна. Адміністрацыя забаўляльнай установы адразу выклікала брыгаду ўрачоў. Пазней, ужо ў шпіталі, была ўстаноўлена дакладная прычына іх смерці — кардыёрэспіраторная недастатковасць. Паліцыя праводзіць следчыя мерапрыемствы для выяўлення вінаватых трагедыі. Падчас святкавання Хэлоўіна ў памяшканні комплексу было надзвычай цесна і душна з-за велізарнага наплыву наведвальнікаў. Адначасова тут сабралася каля 10 тысяч маладых людзей. У памяшканні першапачаткова прадугледжаны два выхады на вуліцу, аднак адзін з іх у момант правядзення вечарынкі, па сведчанні відавочцаў, быў заблакаваны.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

У ПАЎНОЧНАЙ КАРЭІ З'ЯВІЦЦА ПЕРШЫ «ЗАХОДНІ» АТЭЛЬЕР

Нямецкая гасцінічная група Kempinski AG будзе кіраваць самым высокім гатэлем у свеце — знакамітым даўгабудам «Руген» (Ryugyong Hotel) у Пхеньяне. Як паведамляецца, Kempinski стане першым у Паўночнай Карэі гасцінічным аператарам з краін Еўропы або ЗША.

Адкрыццё 105-павярховага (330 метраў) гатэля намечана на сярэдзіну 2013 года. Зараз у будынку заканчваецца будаўніцтва вестыбюля і банкетных залаў, вядуцца аздабленчыя работы. Акрамя гасцінічных нумароў, у «Ругене» размесцяцца офісы, крамы і рэстараны. Па інфармацыі «Інтэрфакса», першымі пастаяльцамі гасцініцы, паводле дамоўленасці паміж уладамі КНДР і КНР, стануць кітайцы.

Будаўніцтва гасцініцы пірамідальнай формы пачалося ў 1987 годзе па распараджэнні былога лідара КНДР Кім Ір Сена. Урад Паўночнай Карэі разлічваў адкрыць хмарачос у чэрвені 1989 года да Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў, аднак у 1993 годзе фінансаванне праекта было спынена. «Размарозіць» будоўлю ўдалося толькі ў 2008 годзе, калі ўлады Паўночнай Карэі заключылі пагадненне на 400 мільёнаў долараў з егіпецкай тэлекамунікацыйнай кампаніяй, якая пагадзілася завяршыць даўгабуд у абмен на права па распрацоўцы сваёй мабільнай сеткі. Праект высоткі неаднаразова падвяргаўся крытыцы з боку міжнароднай архітэктурнай супольнасці, а некаторыя эксперты называлі «Руген Гатэль» самым выродлівым хмарачосам у свеце.

ЯК ВЫ БАВІЦЕ ВОЛЬНЫ ЧАС, КАЛІ НА ВУЛІЦЫ НЕПАГАДЗЬ?

Іна КАСІНЕЦ, супрацоўніца «Аршанскай газеты»:

— Дрэннае надвор'е — гэта час заняцца тым, што заўсёды адкладваецца на пасля. Наведаць родных, спячы мудрагелісты пірог і пазваць сяброў на гарбату. Калі ідзе дождж, мне падабаецца рабіць запісы ў дзённіку, ацэньваць зробленыя ўчынкі. І галоўнае — імкнуцца не дазволіць дрэннаму надвор'ю завалодаць тваім настроем.

Максім СТАЯН, студэнт Інстытута журналістыкі БДУ:

— Насамрэч усё залежыць ад адчуванняў. Часам хочацца проста паглядзець які-небудзь фільм, часам пайграць на гітары. Бо дрэннае надвор'е на вуліцы — самы час для творчасці. Прычым творчасць можа быць адлюстравана не толькі на паперы. У дрэннае надвор'е добра ствараць кулінарныя шэдэўры. Здараецца, хочацца прыгатаваць штосьці вельмі прыгожае і апетытнае, каб разбавіць шэрасць за акном.

Яўгенія СГАЯН, выхавальніца ў дзіцячым садку:

— Калі за акном непагадзь, я люблю пачытаць, бо ў сонечны дзень больш складана сесці за кнігу. Напрыклад, гэтымі пахмурнымі днямі я чытала Гэры Чэпмэна «Пяць шляхоў да сэрца дзіцяці», што аказалася вельмі дарэчы для маёй працы. Таксама я люблю займацца рукадзеллем: рабіць са стужак розныя кветкі, упрыгажэнні, вязаць кручком. Такім чынам, можна спакойна пасядзець, зрабіць любімыя справы, бо ніхто цябе не чапае, не кліча на вуліцу, калі там шэра і холадна.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.

ISSN 1990 - 763X

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРАПАНОЎВАЕ ПАСТУПОВА ПРЫВОДЗІЦЬ ДА ЎЛАДЫ МАЛАДЫХ ПАЛІТЫКАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Максім Рыжанкоў, які назначаны памочнікам Прэзідэнта па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму, як чалавек «з вопытам дыпламатычнай работы можа шмат дабавіць у скарбонку спорту», падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі ўскладае вялікія надзеі на новага міністра спорту і турызму Аляксандра Шамко, які, працуючы ў сістэме МНС, курыраваў пажарна-выратавальны спорт, і зборная каманда неаднаразова перамагала на сусветных чэмпіянатах. Характарызуючы новых спартыўных назначэнцаў, Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: «Гэта людзі не выпадковыя ў спорце і сістэме кіравання, моцныя мужчыны, два генералы не толькі з высокім званнем, але якія добра ведаюць і, што вельмі важна, любяць спорт, маюць вопыт работы ў гэтай сферы». Аляксандр Лукашэнка растлумачыў, чым ён кіраваўся, назначаючы новых кіраўнікоў у спартыўным ведамстве: «Гэта павінны быць людзі з боку. Я не шукаў гэтыя кандыдатуры сярод так званых спецыялістаў ад спорту. Таму што мяне насцярожвае не толькі бяздзейнасць былых кіраўнікоў, але і факты карумпіраванасці гэтых людзей. Таму кланавасці трэба было пазбегнуць, і таму назначыў і рэкамендаваў людзей з боку. Гэта людзі, якія разумеюць і любяць спорт».

Кіраўнік дзяржавы прадоўжыў: «Людзі, якія не бегалі і не скакалі, і клюшку ў руках не трымалі, не могуць быць кіраўнікамі ў спорце. Усе тры новыя назначэнцы са спортам дружаць. Што датычыцца нейкіх там разважанняў наконт падводных плыней, айсбергаў, паверце: тут такога абсалютна няма». Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што новыя спартыўныя кіраўнікі — гэта людзі, якія балеюць за краіну і спорт, дасведчаныя, здольныя асвоіць тое, што ёсць, і мадэрнізаваць сістэму. Менавіта такая задача перад імі пастаўлена. Галоўнае — працаваць, дзейнічаць, не спыняцца.

ВІНШАВАННЕ ПРЭЗІДЭНТА

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў установы «Беларуская дзяржаўная ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармонія» з 75-годдзем заснавання філармоніі.

«Вядучая канцэртная ўстанова краіны прайшла доўгі, напоўнены здзяйсненнямі шлях, унесла вялікі ўклад у развіццё і прапаганду нацыянальнага музычнага мастацтва, папулярызацыю лепшых узораў айчыннай і замежнай класікі і эстэтычнае выхаванне многіх пакаленняў беларусаў», — гаворыцца ў віншаванні.

Як адзначыў Прэзідэнт, сёння Беларуская дзяржаўная філармонія з гонарам выконвае сваю пачэсную місію — нясе людзям свет высокай духоўнасці і культуры.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Заслугі беларуса ў асваенні космасу прызналі расійскія акадэмікі

Рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Сяргей Абламейка абраны Ганаровым членам Расійскай акадэміі касманаўтыкі імя К.Э. Цыялкоўскага. Гэтае рашэнне стала фактам прызнання асабістых заслуг Сяргея Абламейкі ў справе асваення касмічнай прасторы і ўмацавання навуковых і вытворчых сувязяў прадпрыемстваў і арганізацый касмічнай галіны Расіі і Беларусі.

Членамі Расійскай акадэміі касманаўтыкі могуць быць акадэмікі (дзейныя члены) і члены-карэспандэнты, якія выбіраюцца з грамадзян Расійскай Федэрацыі. Іншаземцаў выбіраюць Ганаровымі членамі, і іх зараз у Расійскай акадэміі касманаўтыкі ўсяго 14. З беларусаў такога гонару ўдастоены толькі Сяргей Абламейка.

Надзея НІКАЛАЕВА.

УСЁ ДЛЯ КОЛАСА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На мерапрыемстве прысутнічала і Вікторыя Калеснік, дырэктар Кіеўскага літаратурна-мемарыяльнага музея Максіма Рыльскага, з якім у Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа падпісана пагадненне аб супрацоўніцтве (сёлета яму 10 гадоў). Так, ва Украіне сёлета прайшла не адна імпрэза, прысвечаная беларускім класікам Янку Купалу і Якубу Коласу.

Адмыслова на «Каласавіны» прыехала ў Мінск і Святлана Дашкевіч, літаратурны рэдактар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа, якая расказала пра ўшанаванне памяці паэта ў тэатры яго імя. Прысутнічалі і Аляксандр Прановіч, дырэктар Пухавіцкага раённага краязнаўчага музея, самага буйнога музея Якуба Коласа па-за межамі Мінска; Эльвіра Калашнікава, вучоны сакратар Літаратурна-мастацкага музея Марыны і Анастасіі Цвятаевых (г.Аляксандраў, Уладзімірская вобласць, Расія); дырэктары школ і бібліятэк, якія носяць імя Якуба Коласа і прадстаўнікі многіх іншых арганізацый.

Падчас пасяджэння абмяркоўваліся пытанні надання вуліцам, бібліятэкам і іншым установам імені Песняра. Аляксандр Прановіч распавядае:

— У нас, у Мар'інай Горцы ёсць вуліца імя Якуба Коласа. Але няма бібліятэкі з імем паэта. Мы будзем уздымаць пытанне, каб надаць адной з бібліятэк імя нашага класіка. Можа быць, нават цэнтральнай.

Сёння ў рамках «Каласавін» адбудзецца XXVII Міжнародная навуковая канферэнцыя «Якуб Колас. Чалавек. Эпоха. Час», а заўтра а 12-й гадзіне, у дзень 130-годдзя Песняра, — урачыстая цырымонія ўскладання кветак да помніка Якубу Коласу на плошчы яго імя ў Мінску.

Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ.

ПРЭЗІДЭНТ ПАДПІСАЎ ЗАКОН АБ БЮДЖЭЦЕ ФОНДУ САЦЫЯЛЬНАЙ АБАРОНЫ НАСЕЛЬНІЦТВА НА 2013 ГОД

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў закон «Аб бюджэце дзяржаўнага пазабюджэтнага фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Рэспублікі Беларусь на 2013 год». Дакумент афіцыйна апублікаваны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале.

Закон прыняты Палатай прадстаўнікоў 2 кастрычніка бягучага года, адобраны Саветам Рэспублікі 10 кастрычніка. Ён уступае ў сілу з 1 студзеня 2013 года. Структура расходнай і даходнай частак бюджэту фонду ў 2013 годзе практычна не мяняецца ў параўнанні з папярэднімі, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Фондзе сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Так, даходы фонду прадугледжаны ў аб'ёме Br69 трлн. 936 млрд. 504,6 млн., расходы — Br69 трлн. 88 млрд. 74,6 млн. Прафіцыт фарміруецца перавышэннем даходаў над расходамі за кошт сродкаў прафесійнага пенсійнага страхавання ў суме Br848 млрд. 430 млн.

Найбольшую ўдзельную вагу ў даходнай частцы займаюць абавязковыя страхавыя ўзносы — Br68 трлн. 248,6 млрд., узносы на прафесійнае пенсійнае страхаванне — Br490,3 млрд. Што датычыцца непадатковых даходаў, то большую частку займаюць даходы ад размяшчэння ўзносаў на прафесійнае пенсійнае страхаванне — Br407,4 млрд., а таксама даходы ад капіталізацыі часова свабодных сродкаў дзяржаўнага сацстрахавання — Br388 млрд. Іншыя паступленні ў структуры непадатковых даходаў плануюцца ў памеры Br402,2 млрд.

Асноўная частка расходаў — 76,8 працэнта (Br53 трлн. 75,9 млрд.) — пойдзе на выплату пенсій. На фінансаванне выплаты дапамог па часовай непрацаздольнасці, цяжарнасці і родах, у сувязі з нараджэннем дзіцяці, жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўныя аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей, на пахаванне прадугледжана 19,9 працэнта расходнай часткі бюджэту фонду (Br14 трлн. 255,6 млрд.). Прычым памер выплат дапамог на дзяцей ва ўзросце да 3 гадоў закладзены ўжо з улікам новага механізма іх разліку (у прывязцы да сярэдняй заработнай платы па рэспубліцы). Фінансаванне мерапрыемстваў па забеспячэнні занятасці насельніцтва складае Br290 млрд. 898,2 млн., з іх субвенцыі ў бюджэты абласцей і Мінска — Br284 млрд. 818,8 млн. Аб'ём фінансавання расходаў на санаторна-курортнае лячэнне і аздараўленне прадугледжваецца ў памеры Br408 млрд. 736,5 млн.

СІРОТЫ НЕ ПАВІННЫ ВЫХОЎВАЦЦА Ў ІНТЭРНАЦЕ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

А вынікам рэалізацыі гэтага праекта стала надзейнае супрацоўніцтва з дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі адукацыі і абароны дзяцінства па ўсёй краіне, якіх налічваецца паўтары тысячы. Вынікі былі падведзены ў апошні дзень кастрычніка на канферэнцыі, якая адбылася ў Мінскім міжнародным адукацыйным цэнтры.

— Сёння нашы спецыялісты працуюць у 168 адміністратыўных адзінках краіны. Гэта як раёны, так і пасёлкі гарадскога тыпу. Адметна, што там, дзе праца вядзецца ўжо не адзін год, у дамы-інтэрнаты трапляе толькі пяць-шэсць працэнтаў ад агульнай колькасці сірот. У той жа час па краіне гэтая лічба дасягае амаль дваццаці працэнтаў, — гаворыць **дырэктар Прадстаўніцтва Міжнароднага дзіцячага фонду ў Рэспубліцы Беларусь Ірына МІРОНАВА.** — Мы максімальна садзейнічаем таму, каб дзіця расло ў сваёй біялагічнай сям'і. І толькі тады, калі гэтага па розных прычынах зрабіць нельга, дапамагаем яму знайсці новую сям'ю. Але мы выступаем катэгарычна супраць змяшчэння сірот у інтэрнаты. Таму што толькі ў сям'і дзіця зможа атрымаць належнае выхаванне і прыстасуецца да ўмоў дарослага жыцця. Вельмі сумна, калі ў інтэрнат на працяглы час трапляюць маленькія сіроты, якім яшчэ не споўнілася тры гады. Бо ў гэтым узросце фарміруецца свядомасць, псіхіка дзіцяці. А інтэрнат фізічна не можа даць самага галоўнага — адданасці і прыхільнасці. Гэта адбываецца з-за таго, што маленькі чалавечак рэгулярна бачыць вакол сябе новых выхавацеляў. І чым больш часу дзіця правяло ў інтэрнаце, тым вышэй рызыка таго, што яно вырасце адзінокім.

— У параўнанні з пачаткам 2008 года колькасць сірот у дамах-інтэрнатах зменшылася больш чым на сорак працэнтаў. І саміх інтэрнатаў з-за недахопу выхаванцаў стала менш на 25. А яшчэ дзесяць гадоў таму туды трапляла кожнае другое такое дзіця. Зараз жа інтэрнат чакае толькі тых дзяцей, для якіх увогуле не знайшлося ніякага шанца знайсці другую сям'ю. Таму зараз для Беларусі гэтая праблема паўстала не настолькі востра, як у мінулым дзесяцігоддзі. Але і назваць яе да канца вырашанай пакуль таксама нельга, — мяркуе **начальнік аддзела сацыяльна-педагагічнай работы і аховы дзяцінства ўпраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь Галіна РУДЗЯНКОВА.**

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

КАНФІСКАВАЛІ АЎТАМАБІЛЬ З-ЗА НЯВЫПЛАЧАНАГА ДОЎГУ

Судовыя прыставы канфіскавалі аўтамабіль у таксіста ў Мінску з-за нявыплачанага доўгу, паведаміла БЕЛТА старшы інспектар па агітацыі і прапагандзе АДАІ Фрунзенскага раёна сталіцы Алена ВОЛЧАК.

Эксперымент Фрунзенскага АДАІ, падчас якога разам з інспектарамі на дзяжурства выходзяць судовыя выканаўцы, прыносіць свае першыя вынікі. За два дні работы такім спосабам выяўлена 10 даўжнікоў. «У большасці былі запазычанасці па аплаце камунальных паслуг альбо штрафаў ДАІ, альбо аліментаў», — патлумачыла Алена Волчак. 8 чалавек аплацілі патрабаваную суму на месцы, іх запазычанасць была не надта вялікая. Але ў двух выпадках судоваму выканаўцу прыйшлося складаць вопіс — маёмасць даўжнікоў была канфіскавана.

Так, інспектары спынілі таксі. Вадзіцельскае пасведчанне і ўсе іншыя дакументы былі ў парадку, але калі прыстаў «прабіў» кіроўцу па сваёй базе, аказалася, што за таксістам лічыцца доўг перад прадпрыемствам у 11 млн рублёў, адзначыла старшы інспектар. Грошы даўжнік выплаціць на месцы не змог, і тады ў яго канфіскавалі аўтамабіль. Судовы работнік склаў акт аб вопісу маёмасці, і аўто пры дапамозе эвакуатара адагналі на адмысловую стаянку. «Па законе ў даўжніка ёсць 10 сутак, на працягу якіх ён абавязаны пагасіць доўг. Калі гэтага не адбудзецца, яго аўтамабіль будзе рэалізаваны, каб пагасіць патрэбную суму», — патлумачыла Алена Волчак.

Яшчэ ў аднаго неплацельшчыка канфіскавалі мабільны тэлефон. У яго таксама ёсць 10 сутак, каб пазбавіцца ад доўгу і вярнуць сваю маёмасць.

Акцыя працягнецца, але яе станоўчыя вынікі ўжо відавочныя. Вядома, што ідэю Фрунзенскага АДАІ будуць перайманць і ў іншых раёнах горада.

Раней паведамлялася, што з 30 кастрычніка па 9 лістапада аддзяленне ДАІ Фрунзенскага раёна сталіцы абвясціла аб правядзенні эксперыментальнага рэйду. Разам з экіпажамі ДАІ на патруляванні прысутнічае судовы выканаўца. Ён правярае па электроннай базе тых удзельнікаў дарожнага руху, каго спыняць для праверкі супрацоўнікі ДАІ. У выпадку, калі хто-небудзь з правяраемых аказваецца дзяржаўніком, у дачыненні да яго прымяняюцца адпаведныя меры: так, калі штраф нязначны, яго прапануюць аплаціць на месцы, выдаючы адпаведную квітанцыю. Калі сума штрафу аказваецца вялікай і даўжнік не можа выплаціць яе на месцы, то судовы прыстаў мае права канфіскаваць у якасці закладу якую-небудзь маёмасць даўжніка — гэта можа быць мабільны тэлефон, запасное кола аўтамабіля і г.д. У выпадку, калі сума будзе асабліва буйной, можа быць канфіскаваны транспартны сродак да моманту выплаты доўгу.

СНЕГ ЗМЫЕ ДАЖДЖОМ

У нядзелю прагназуецца да плюс 13

З першых дзён лістапада на тэрыторыю Беларусі зноў вяртаецца цяпло. Ужо ў пятніцу да нас завітаюць цёплыя паветраныя масы з боку паўднёвага захаду Еўропы, паведамілі рэдакцыі ў Рэспубліканскім гідраметэацэнтры Мінпрыроды.

Сёння ўдзень на большай частцы краіны пройдуць дажджы. Месцамі чакаецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра — 2—7 цяпла, па паўднёвым захадзе — да плюс 10 градусаў. У суботу надвор'е істотна палепшыцца. Дажджы чакаюцца толькі ўначы. У асобных раёнах ўначы і раніцай туман. Удзень кароткачасовыя дажджы будуць выключна месцамі, а на астатняй тэрыторыі ўсталюецца сонечнае надвор'е. Тэмпература ўначы плюс 1—6, удзень — 5—10 цяпла, а па паўднёвым захадзе ажно да плюс 12 градусаў. Захаваецца цёплае надвор'е і ў нядзелю. Толькі месцамі прагназуецца невялікі дождж. Тэмпература ўначы 1—7 цяпла, удзень пацяплее да плюс 6—11, а па поўдні краіны — да плюс 13 градусаў. Паводле папярэдніх прагнозаў, будзе цёпла ў Беларусі і ў першыя дні наступнага тыдня. Удзень невялікія дажджы і каля 5—10 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Утерянные сертификаты по централизованному тестированию по физике и математике за 2012 год на имя Черного Александра Игоревича, паспорт НВ 2006637, считать недействительными.

БЕЗ ТЭРМІНУ ДАЎНАСЦІ

■ Подых вайны

ГІСТАРЫЧНЫЯ ДАКУМЕНТЫ ТРЭБА АЦЭНЬВАЦЬ КРЫТЫЧНА

У Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П.М. Машэрава адбылася навукова-практычная канферэнцыя «Партызанскі і падпольны рух на Віцебшчыне ў 1941—1944 гадах» у рамках міжнароднага праекта «Павышэнне статусу выратаваных жыхароў спаленых беларускіх вёсак 1941—1944 гг.»

Сёння Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь — галоўнае сховішча дакументаў партызанскага руху і падполля, якое дзейнічала на тэрыторыі рэспублікі ў гады вайны. У пасляваенны перыяд ЦК КПБ прыняў шэраг пастаноў, накіраваных на прывядзенне ў парадак, захаванне і выкарыстоўванне гэтых дакументаў. У выніку ўсе яны былі сканцэнтраваны ў партыйным архіве ЦК (за выключэннем дакументаў спецыяльных груп і атрадаў дзяржаўнай бяспекі, унутраных спраў і ваеннай разведкі).

— Трэба прызнаць, што манаполія Камуністычнай партыі на дакументы партызанскага руху і падполля адмоўна адбівалася на распрацоўцы гэтай тэматыкі. Зараз усе дакументы адкрытыя. Адзін з германскіх фондаў ініцыяваў праект, а нацыянальны архіў узяў на сабе вядзенне навуковай работы. Ужо выпушчаны зборнік дакументаў, які расказвае аб трагедыі беларускіх вёсак у 1941—1944 гадах. Працягваецца работа над стварэннем электроннай базы беларускіх вёсак, знішчаных у вайну. Падчас гэтай работы мы пераглядзелі практычна ўсе дакументы па гісторыі беларускага партызанскага руху — вельмі цікавыя рэчы знайшлі. У наступным годзе спаўняецца 70 гадоў адной з буйнейшых экспедыцый гітлераўскіх карнікаў у Беларусі на тэрыторыі цяперашняга Верхнядзвінскага раёна, якая называлася «Зімовае чараўніцтва», — расказвае **Вячаслаў СЯРГЕЕЎ, галоўны архівіст нацыянальнага архіва РБ.** — Да гэтай даты рыхтуем дакументальны зборнік. У яго ўвайшлі не толькі дакументы партызанскіх фарміраванняў, але і нямецкія. І параўнальная характарыстыка дае вельмі дзіўныя вынікі. Знайшлі дакумент аб стратах немцаў: партызаны ў штаб беларускага партызанскага руху паведамілі аб тым, што знішчылі 1557 гітлераўцаў. Нямецкія крыніцы даюць іншую лічбу: страты адной з дзвюх аператыўных груп — толькі 22 чалавекі. Але ж даныя аб 1557 забітых фашістах потым пайшлі ў афіцыйную статыстыку. Аб чым гэта гаворыць? Калі вывучаюцца дакументы пра гісторыю ваенных дзеянняў, трэба вельмі крытычна падыходзіць да той інфармацыі, якая ёсць у дакументах. На жаль, у савецкі час усе лічбы браліся за аснову без усякай праверкі і ўводзіліся ў навуковы абарот.

Яшчэ наконт аперацыі «Зімовае чараўніцтва»... Аб тых падзеях, аб трагічным лёсе дзяцей з цяперашняга Верхнядзвінскага раёна, якіх вывезлі ў Латвію, знялі фільм. Пра тое, што пасля вайны многія з вывезеных засталіся там, а пасля развалу СССР іх пазбавілі грамадзянскіх правоў і назвалі акупантамі. Гэтая старонка гісторыі зацікавіла нямецкую грамадскасць — у прыватнасці, нямецкі фонд «Кантакт». Калі ў фондзе стала вядома аб лёсе гэтых людзей, пачалі выплату ім невялікіх сум з гуманітарных сродкаў. Гэта недзяржаўная дапамога. У выніку ўжо 90 жыхароў, якія засталіся ў жывых пасля спальвання беларускіх вёсак у Верхнядзвінскім раёне, атрымалі яе. Таксама з Германіі ім прыслалі лісты з просьбай аб дараванні за зробленае калісьці.

Аляксандр ПУКШАНСКІ ■

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Верхнядзвінскі краязнавец Антон Францавіч Бубала — адзін з нямногіх, хто цудам выжыў. Падчас тых страшных падзей ён быў яшчэ немаўлём. Нядаўна Антону Францавічу споўнілася семдзесят. Сярод шматлікіх віншаванняў быў і ліст з Масквы — з фонду «Гістарычная памяць». Дырэктар фонду А.Р. Дзюкаў, у прыватнасці, пісаў: «Хочам павіншаваць Вас, нашага калегу, з юбілеем! Немагчыма не адзначыць Вашу шматгадовую дзейнасць, накіраваную на захаванне гісторыі свайго краю, вядомую як у Беларусі, так і за мяжой...».

Як аўтару гэтага артыкула, мне было вельмі цяжка: з аднаго боку, у паважанага чалавека юбілей, які адзначаецца пры падтрымцы кіраўніцтва раённай улады. А з другога — мне патрэбна была дапамога менавіта Антона Францавіча, каб атрымаць праўдзівую інфармацыю пра ўсе жахі карных аперацый, расказаць аб лёсе людзей, якія перажылі столькі гора. Краязнаўцам у свой час быў запісаны ўспамін Ю. Давыдзёнак. Многія ўспаміны надрукаваны ў зборніку «І былі разам — дзяцінства і вайна». Успаміны М. Макеенак надрукаваны ў раённай кнізе «Памяць»...

— Мне, бадай, лягчэй за ўсіх, бо я нічога не памятаю. А вось мая мама... Яна была для мяне «святой за ўсіх святых». Тое, што ёй давялося перажыць у вайну, не апішаш і ў сотнях тамоў. Яна пранесла нас, трох сваіх малых дзяцей, праз снягі, балоты і канцлагер, баючыся аднаго: як бы не загінуць самой, пакінуўшы нас безабароннымі. У пачатку самага страшнага этапу свайго «падарожжа» па вайне, калі вакол ужо ўсё гарэла і яна стаяла ў гумне, молячыся, каб, калі яе чакае смерць, то няхай фашыст праколе нас усіх разам з ёю штыком, — партызан параіў ёй выйсці на дарогу. Маўляў, там бамбяць, і смерць будзе адна для ўсіх адразу, — расказвае **Антон Францавіч БУБАЛА.** — І яна пайшла па вялікай дарозе. Напэўна, мы б загінулі, калі б не яе старэйшая сястра, якая, пакінуўшы свой «вывадак» (чацвярых) у склепе царквы ў Асвеі, якую ўжо бамбілі, прыгнала за намі санкі. Па дарозе на санках набралася ўжо паўтара дзясятка малых. Дарогу бамбілі, уцекачы паехалі цераз возера па лёдзе, ды яшчэ карову цягнулі поцягам. Далей быў лес...

Стрыечная сястра Антона Бубалы, Вера, жывая і зараз — з той чацвёркі засталася адна. Ёй было тады гадоў адзінаццаць. Яна дапамагала маме ратаваць дзяцей у снезе, а пасля агульнага для сям'і канцлагера ў Саласпілсе была вывезена разам з братамі і маці пад бомбамі параходам у Германію (бацька ў іх быў рэпрэсаваны). А яшчэ Антон Францавіч расказаў аб сваіх сястры і браце. Сястра — светлая душа і разумніца, былая пявуння; ёй было два з паловай — там, у снягах. Зараз у яе ўсё добра, ды толькі ногі моцна баляць. Брат быў прыгажун, асілак — першы хлопец на вёсцы, але яму больш за ўсё дасталася пасля вайны. Цяпер ён ужо сем гадоў не ўстае.

❍ ❍ ❍

Антон Францавіч Бубала правёў велізарную работу: запісаў успаміны былых жыхароў «вогненных» вёсак, адпаведную інфармацыю адправіў у Германію — у дабрачынны фонд «Кантакт», актывісты якога лічаць сваім абавязкам аказаць людзям, якія моцна пацярпелі ад фашыстаў, не толькі маральную, але і фінансавую падтрымку. Афіцыйныя ўлады Германіі пакуль што не далучыліся да ўдзелу ў гэтым працэсе. Многім з тых, хто выжыў, і іх сваякам ужо, на жаль, ніякая кампенсацыя не патрэбна. Сёння родныя і блізкія ўцалелых у пекле імкнуцца зберагчы іх ад стрэсаў, а самі пацярпелыя часта адмаўляюцца дзяліцца цяжкімі ўспамінамі, якія да гэтага часу прыходзяць у іх сны...

Краязнавец Антон Францавіч Бубала запісвае ўспаміны Юзэфы Давыдзёнак.

Вясну пражылі ў будане і ямах — «зямлянках». У напаўраздзетых людзей вельмі хутка скончыліся запасы ежы. Елі пупышкі і кару дрэў, мох, а калі з'явіліся праталіны,— траву. Хтосьці прыхапіў з сабой чыгунок, і ў ім заварвалі «чай» з хваёвай ігліцы, разводзячы вогнішча днём, каб не дэмаскіраваць сябе ноччу, бо над лесам ляталі самалёты. У такіх умовах усе галадалі і хварэлі. Памерлых хавалі ў лесе, без усялякіх рытуалаў: клалі ў неглыбокія магілкі, накрывалі яловым лапнікам, засыпалі пяском і маліліся.

Становішча было адчайным, таму вырашылі зрабіць вылазку ў прылеглую вёску Саломіна, таксама спаленую, па бульбу, якую сяляне захоўвалі ў земляных ямах. Адна з іх аказалася некранутай. Мужчыны падавалі бульбу наверх, а дзяўчыны засыпалі яе ў мяшкі. Але не паспелі засыпаць і некалькіх вёдзер, як паказаліся карнікі, пачалі страляць... Пазней забітых пахавалі паблізу ад месца расправы. А праз дзесяць гадоў пасля вызвалення Юзэфа занесла вузельчык пяску з жалобнай мясціны ў Асвею, дзе вырастаў Курган Памяці. З такімі вузельчыкамі да Асвеі ў тыя дні ішлі па ўсіх дарогах тыя, хто вярнуўся на родныя папялішчы.

— Наш лясны лагер да пары не чапалі, каб сэканоміць час на паляванне на людзей у вялікіх лясах. Калі там была праведзеная «ачыстка», прыйшлі і да нашай схованкі — фашыстаў напярэдадні 1 мая прывёў здраднік. Змардаваных людзей прыгналі ў бліжэйшую вёску Селядцова, дзе стаяў хлеў. «Загнаўшы» людзей у будыніну, забілі дзверы. У чаканні смерці няшчасныя праляжалі на зямлі двое сутак. Стаяць у іх не было сіл,— успамінае **Юзэфа Іванаўна ДАВЫДЗЁНАК.** — Калі загучалі галасы за сцяной, жанчыны пачалі маліцца... Нямецкі афіцэр праз перакладчыка коратка патлумачыў, што паступіла каманда больш нікога не паліць — усё роўна старым, хворым ды малым хутка будзе капут. А немцам патрэбны працоўныя рукі.

За некалькі дзён палонных прывялі на станцыю Дрыса. Па шляху адбіралі аслабелых — іх палілі ў Бажках, Азерніках, расстрэльвалі ў Крыжборыку.

На станцыі прыгнаных трымалі ў бараку нядоўга. Рассялілі па хатах у Бялькоўшчыне, даўшы ўказанне штодня выходзіць на працу, але ежу знаходзіць самастойна. Такі лад жыцця арыштанты вялі да самага вызвалення. Паўсюль лютаваў тыф. У сям'і Карвэцкіх хварэлі ўсе: маці і дзве дачкі. Брат ужо быў у канцлагеры далёка за Берлінам (яго вызвалілі амерыканцы). Пасля вызвалення вярнуліся на свае папялішчы. Жылі ў шалашах, капалі зямлянкі... Побач, на полі, ляжалі сотні, а можа, і тысячы трупаў, галава кружылася ад трупнага паху... Але гэта ўжо было мірнае жыццё.

Юзэфа Іванаўна рана засталася ўдавой. Сёлета памёр старэйшы з трох яе сыноў. У жанчыны — цяжкая форма астмы.

❍ ❍ ❍

Марыя Фёдараўна Макеенак (Дашкевіч) нарадзілася 26 лютага 1927 г. у вёсцы Лісна. У сялянскай сям'і было пяцёра дзяцей. Бацька — інвалід Першай сусветнай — у 1942 годзе пайшоў у партызаны. Падчас адной з карных экспедыцый вёску Лісна спалілі. Лес тут падступае да дамоў і агародаў, таму пад покрывам дыму маці з дзецьмі ўдалося схавацца ў лесе. Каб не памерці з голаду, жанчына павяла дзяцей у лясную вёску Латыгава, якая аказалася спаленай. Пагарэльцы пайшлі ў глыб лесу, у вёску Ардаўскія. Яна аказалася таксама спаленай, але ўцалелыя жыхары вярнуліся сюды і туліліся ў зямлянках. Далей распавядае сама Марыя Фёдараўна:

— Мы хаваліся проста ў лесе, у самых глухіх урочышчах. Я і дзве мае сястрычкі захварэлі на тыф. У лес прыйшла сястра маці і сказала, каб мы ішлі ў вёску, інакш памром ад голаду, холаду і тыфу. У Ардаўскіх мы паспелі толькі пераначаваць, а раніцай вёску акружылі карнікі. Прыйшлі ў нашу зямлянку, крыкнулі «Хальт!». Але ўбачыўшы, што мы ўсе хворыя, заштурхалі нас назад. Потым фашыст стаў на выхадзе, дастаў пісталет і пачаў страляць. Адразу забіў нашу цётку Еўдакію, а цётку Марыю параніў: куля прайшла навылет праз лёгкія. Яе дачушку, якую яна трымала на руках, забіў. Другую, Валю, параніў. Маю сястру параніў у нагу, — успамінае **Марыя ФЁДАРАЎНА.** — Падняўся крык, пачуліся стогны. Раптам з'явіўся яшчэ адзін фашыст, схапіў гэтага за шынель і пацягнуў з зямлянкі. Я ляжала на нарах, калі прыбегла мама і сказала: «Дзеткі, хавайцеся, будуць кідаць гранаты». Сама яна прысела каля печы. Я закацілася пад нары, і раптам выбух: праз акно кінулі гранату. Другую гранату закінулі ў трубу. Печка і труба абрынуліся, многіх пасекла асколкамі. Так і ляжалі. Я паспрабавала адштурхнуць нагой забітую жанчыну, але нічога не атрымалася... Выцягнула мяне з-пад нараў маці. Падаліся ў лес. Бацька паранены, сястра сцякае крывёю, п'ём з кожнай лужыны... Мы жылі ў лесе. Маці хадзіла ў спаленую вёску, шукала закапанае збожжа; мы смажылі зерне на агні і елі патрошку — як дарагую страву. Калі з'явілася крапіва, мы павесялелі. Так і дацягнулі да таго часу, пакуль не прыйшлі нашы.

❍ ❍ ❍

На жаль, нельга ў адным, ды нават у некалькіх нумарах, змясціць усе аповеды тых людзей, якія жылі ў спаленых вёсках, пацярпелі ад фашыстаў. Шкада, што немагчыма надрукаваць падрабязна іх успаміны. Такія людзі, як Антон Францавіч Бубала, вядомы пісьменнік Сяргей Сцяпанавіч Панізнік і іншыя даследчыкі гісторыі роднага краю ў сваіх даследаваннях і творах апісвалі, якой жудаснай для мірных насельнікаў акупаваных тэрыторый была вайна, як лютавалі фашысцкія нелюдзі, як знішчалі ні ў чым не вінаватых людзей. Боль і трагедыя не маюць тэрміну даўніны. І вельмі важна, што нашчадкі тых, хто прынёс столькі гора беларусам, як могуць, стараюцца дапамагчы былым жыхарам спаленых вёсак. Апошніх штогод становіцца ўсё менш. Хочацца спадзявацца, што і з боку кіраўніцтва Германіі ўрэшце будзе зроблены крок ім насустрач. За грахі мінулага трэба плаціць, як гэта было зроблена ў дачыненні да былых вязняў канцлагераў. Нельга не паважаць немцаў, якія ў свой час зразумелі, што афіцыйныя прабачэнні (як і матэрыяльная падтрымка) — гэта частковая кампенсацыя той шкоды, якую прычынілі акупанты жыхарам захопленых тэрыторый. Былыя насельнікі «вогненных» вёсак вартыя такой увагі і да сябе.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
Верхнядзвінскі раён.

❍ ❍ ❍

Гісторый, падобных на гэтыя, нашмат больш, чым прынята лічыць. Людзі, якія прайшлі праз пекла «вогненных» вёсак, праз жудасныя здзекі і катаванні, сёння дажываюць свой век, не маючы статусу ахвяр нацызму, не атрымаўшы адпаведных кампенсацый.

«Звязда» ніколі не была ў баку ад гэтай балючай тэмы. Не застанецца і цяпер. Што мы можам? Адшукаць жывых сведкаў, сабраць дадатковую інфармацыю, расказаць пра энтузіястаў, якія ўжо не першы год збіраюць успаміны жыхароў спаленых вёсак... Чаму мы гэта робім і будзем рабіць? Таму што памяць патрэбна ўсім. І тым, хто хацеў жыць, але загінуў у полымі вайны. І тым, хто выжыў. Можна, змяніўшы чалавечае аблічча на аблічча нелюдзяў, спаліць вёску, але нельга знішчыць памяць і боль. Боль 629 беларускіх вёсак, з якіх амаль 200 ужо ніколі не з'явяцца на карце.

Сёння мы зноў запальваем «свечкі памяці», якія будуць «гарэць» увесь наступны год — год жалобнага юбілею, а гісторыі «вогненных» вёсак будуць апякаць нашы сэрцы...

ПАНЯДЗЕЛАК, 5 ЛІСТАПАДА

БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.15, 8.20 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.00** Навіны.
7.05, 8.05 Дзелавое жыццё.
7.10, 8.10, 18.45, 23.50 Зона Х.
9.10 У цэнтры ўвагі.
10.05 Клуб рэдактараў.
10.45 Вакол планеты.
11.25 Журналісцкае расследаванне.
12.10 Меладрама «Двайная суцэльная. Каханне».
14.00 М/ф «Дзядзька Сцёпа — міліцыянер».
14.20 «Майстар падарожжаў». «Прага і Будапешт».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 «Зорнае жыццё». «Бедныя сваякі зорак».
16.30 Серыял «Містычныя гісторыі».
17.30 «Мая праўда». «Алег Табакоў. Бацька, якому не даравалі».
18.30 Камандзіроўка.
19.40 Калыханка.
19.50 Серыял «Мамачкі».
21.00 Панарама.
21.45 Форум.
22.45 Серыял «Зорныя вароты. Першы атрад».
23.35 «Лістапад-2012».
0.20 Дзень спорту.
0.30 Мюзікл «Мулен Руж».

АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.05 «Жыць здорава!».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 «Сардэчна запрашаем у Беларусь».
12.00 Серыял «Няроўны шлюб».
13.10 Маст. фільм «Караблі штурмуюць бастыён».
14.55 Серыял «Заручальны пярсцёнак».
16.15 Камедыя «Службовы раман. Наш час».
18.20 «Адваротны адлік». «Загадка палкоўніка Гіля. Вяртанне».
18.55 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 «Адкрыты фармат».
22.10 Серыял «Закрытая школа».
23.15 «Вячэрні Ургант».
23.55 «Без сведак».
0.25 «Спіс Кісялёва».
1.25 Начныя навіны.

БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 21.20 Тэлебарометр.
9.05, 17.50 Серыял «Следства вядзе Да Вінчы».
10.10 Навіны надвор'я.
10.45 Экстрасэнсы вядуць расследаванне.
11.55 Школа рамонту.
13.00 Дак. фільм «Дарагія лялькі».
14.05 Пад грыфам «Вядомыя».
14.50, 22.40 Серыял «Деффчонки».
15.25, 21.30 Дэтэктыў «Блізкія людзі». 1-я серыя.
16.40 Беларуская часінка.
18.55 Серыял «Немец». 1-я і 2-я серыі.
21.25 КЕНО.
23.20 Авертайм.
23.50 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.

СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 23.05 «СТБ-спорт».
8.30 «Тыдзень».
9.40 «Вялікае сняданне».
10.20 «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Магілёў.
10.40 «Сямейныя драмы».
11.35, 17.30 «Званая вячэра».
12.35, 18.30 «Слова жанчыне». Серыял.
13.50 «Вялікі горад».
14.25 «Дэтэктыўныя гісторыі».
14.55 Канцэрт Міхаіла Задорнава.
16.50 «Рэпарцёрскія гісторыі».
17.10 «Наша справа».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.30 Маст. фільм «Без асаблівых прыкмет».
22.20 «Гарады, якія спяваюць». Дзённік. Маладзечна.
22.55 «Пагаворым».
23.10 «Тайны свету».
0.05 «Доктар Тырса». Серыял.

МІР

5.00 Маст. фільм «Фантазіі Вяснухіна».
7.30 М/ф: «Чарадзейны пярсцёнак», «Шэры воўк і Чырвоная Шапачка», «Бурая з Маслёнкіна».
8.45 М/с «Смяшарыкі».
9.00, 15.00 Навіны садружнасці (бягучы радок).
9.15 Маст. фільм «Сямнаццаць імгненняў вясны».
15.10 Серыял «Куля-дурніца».
20.45 Маст. фільм «Ваўкі».
22.50 Маст. фільм «Вяртанне браняносца».
3.15 Маст. фільм «Буйны выйгрыш».

8 КАНАЛ

7.00, 12.10, 18.45, 20.50, 23.55 «Надвор'е».
7.05 «На рыбалку».
7.20, 14.50 Серыял «Клан Сапрана».
8.35, 14.20 Серыял «Турэцкая для пачаткоўцаў».
9.05, 17.50 Серыял «Агенцтва «Месяцавае святло».
10.00 «TUT women tv».
10.30 «Сінематограф». Камедыя «12 разгневаных мужчын».
12.15 Маст. фільм «Пяскі часу».
16.00 «Мультпарад».
16.30 «Мой любімы гадаванец».
17.00 Серыял «Пляткарка».
18.50 Серыял «Рым».
20.40 «Вечарніца».
20.55 Містыка «Знаёмцеся, Джо Блэк».

ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00, 19.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
8.30, 18.30 «Гісторыі ў дэталях».
9.00 «Гэта маё дзіця».
10.00, 21.10 Серыял «Пакуль цвіце папараць».
11.00 «Яны пайшлі са сцэны».
12.00, 17.00 «Жаночая форма».
12.30, 17.30 «Жанчыны не даруюць».
13.00 «Усё пад кантролем».
14.00 «Гарадское падарожжа».
15.00 «Шчырая размова».
16.00 «Скажы, што не так?!»
